РЕЗЮМЕ

В статье описывается процесс строительства сельчанами колодца разными способами на Пинщине в середине XX в. Используются личные экспедиционные материалы разных годов.

SUMMARY

The article describes the process of building a well by villagers in different ways in the Pinshchina in the middle of the XX century. Personal expeditionary materials of different years are used.

***Новак В. С.***

# МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЙ АБРАДНАСЦІ ДОБРУШСКАГА РАЁНА

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны*

*(Паступіў у рэдакцыю 14.03.2023)*

Радзінна-хрэсьбінная абраднасць беларусаў – той від мастацтва, у якім яскрава ўвасоблены культ працягу роду, прынцыпы народнай сямейнай педагогікі, маральна-этычныя нормы. Глыбокае спасціжэнне этнічных асаблівасцей на матэрыяле гэтага віду сямейнай абраднасці магчыма дзякуючы вывучэнню мясцовай спецыфікі радзінна-хрэсьбінных абрадаў і звычаяў. У гэтых адносінах цікавасць уяўляюць фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, запісаныя ў палявых экспедыцыях на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў на тэрыторыі Добрушскага раёна Гомельскай вобласці.

Адна з такіх традыцыйна вылучаных частак радзінна-хрэсьбіннай абраднасці, як randодавая, раскрывае сфарміраваную спрадвеку сістэму

народных вераванняў, звязаных з цяжарнасцю жанчыны. Прадстаўлены ў фальклоры беларусаў агульны характар забарон і правіл паводзін парадзіхі, скіраваных на забеспячэнне пасляховых родаў і засцярогу нованароджанага ад хвароб і розных няшчасцяў, выяўляецца праз багацце рэгіянальна-лакальных традыцый і адметную семантыку падобных дзеянняў у розных мясцовасцях, што характэрна і для добрушскай радзінна-хрэсьбіннай абраднасці. Вылучаныя А. С. Фядосікам некалькі груп забарон, звязаных з цяжарнасцю жанчыны, актуальныя і для фактычнага матэрыялу, зафіксаванага падчас палявых экспедыцый у вёсках Добрушскага раёна: «Традыцыйныя забароны, якія існавалі ў народзе для аховы дзіцяці ад усяго негатыўнага ў яго жыцці, сістэматызуюцца па функцыянальна-семантычных групах.

1. Забароны цяжарнай жанчыне дзеянняў, якія могуць нашкодзіць знешняму выгляду дзіцяці або выклікаць хваробу.

2. Засцярогі, прызначаныя прадухіліць дрэнныя паводзіны дзіцяці ў будучым і непажаданыя для яго рысы характару.

3. Забароны дзеянняў, ад якіх залежыць лёс нованароджанага (няшчасце, беднасць, галеча і інш.)» [1, с. 26]. Першыя дзве групы засцярог, умоўна акрэсленыя даследчыкам, знайшлі пацвярджэнне ў лакальных запісах звестак. Калі мець на ўвазе першую вышэйназваную групу забарон (прадстаўлена даволі шырока), то, зыходзячы са сведчанняў жыхароў Добрушчыны, жанчына-парадзіха, клапоцячыся пра знешні выгляд дзіцяці, павінна была як мага часцей сузіраць што-небудзь прыгожае і пазбягаць адваротных сітуацый: *«Цяжарная жанчына ці рожаніца не павінна глядзець на ўсё некрасівае, бо ў яе будзе некрасівы рабёнак»* (зап. ад Валянціны Гаўрылаўны Грудавенка,

1930 г. н., у в. Баршчоўка)[1]. Паводле сведчанняў мясцовых жыхароў, *«цяжарная жанчына павінна піць многа малака, тады кожа дзіцёнка будзе белай, як малако, павінна есці красныя ягады – клюкву, земляніку, каб малы быў румяны»* (зап. ад В. Г. Грудавенка). Што да забарон, звязаных з імкненнем не нашкодзіць знешняму выгляду немаўляці, то сустракаюцца на Добрушчыне як агульнавядомыя ў беларускай традыцыі, так і адзінкавыя, з адметнай семантыкай, напрыклад: забаранялася цяжарнай жанчыне садзіцца на камень, бо лічылася, што *«плод акамянее»* (г. Добруш) [2, с. 191]. Сярод найбольш распаўсюджаных лакальных павер'яў, скіраваных на захаванне жыцця і здароўя нованароджанага, у вёсках Добрушскага раёна былі зафіксаваны наступныя: *«Цяжарная жанчына не павінна станавіцца на вяроўку, бо дзіцятка можа нарадзіцца задушаным пупавінаю»* (в. Знамя) [2, с. 195]; «*Нельга было хватацца за сваё цела, калі жанчына пужалася чаго-небудзь, бо на тым месцы, дзе яна ўхвацілася, у дзіцяці застануцца чырвоныя плямы*» (зап. ад Еўдакіі Якаўлеўны Кліменка, 1929 г. н., у в. Жгунь); *«З успамін, адна жанчына была цяжарная, ударыла чорную свінню нагой у галаву, радзіўся хлопчык з чорным пятном на лбе між вачэй»* (в. Васільеўка) [2, с. 194]; *«Нельга круціць па кругу бялізну – будзе дзіця абвіта пупком»* (зап. ад Ганны Самойлаўны Куляшовай, 1924 г. н., у в. Кругавец).

Другая група засцярог, пры дапамозе якіх, верылі, можна не дапусціць у фарміраванні характару дзіцяці адмоўных рыс, прадстаўлена нешматлікімі прыкладамі. У адпаведнасці з прынцыпамі гамеапатычнай магіі цяжарная жанчына не павінна была ва ўзаемаадносінах з іншымі людзьмі дапускаць непажаданыя для яе

---

[1] У артыкуле выкарыстаны матэрыялы архіва навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.

паводзін падман і зайздрасць: *«Нельга падманваць нікога, завідваць, бо дзіця будзе такім жа»*; *«Нельга было завідуваць на што-небудзь, бо дзіця будзе папрашайкай»* (зап. ад Е. Я. Кліменка ў в. Жгунь).

Асобныя абрадавыя дзеянні, што адбываліся напярэдадні родаў або падчас іх, былі скіраваны на аблягчэнне стану жанчыны. Паводле народных вераванняў, каб роды не былі цяжкімі, *«парадзіху вадзілі кругом стала тры разы»* (зап. ад Е. Я. Кліменка ў в. Жгунь); *«Падчас родаў расчынялі дзверы, развязвалі вузлы, рашчопвалі кажухі, замкі адмыкалі, паясы развязвалі. Верылі ўсе, што гэта аблегчыць роды парадзіхі»* (г. Добруш) [2, с. 189]; *«Калі маладая раджала, так у хаце развязвалі ўсе паясы, размыкалі замкі, дзеўкі косы расплятаці, каб лягчэй было разрадзіцца»* (в. Гардуны) [2, с. 204]; *«Для лёгкіх родаў сцялілі штаны мужчыны на парозе, і бярэменная павінна была пераступіць праз іх»* (в. Перарост) [2, с. 200]. Зыходзячы з успамінаў жыхаркі вёскі Баршчоўка, калі роды былі цяжкімі, *«рожаніцы давалі піць ваду, дзе былі курыныя яйкі. Потым гэтыя яйкі разбівалі»* (зап. ад В. Г. Грудавенка). Не толькі выконвалі абрадавыя дзеянні, скіраваныя на лёгкія роды, але і выкарыстоўвалі магічную сілу слова. Як паведаміла інфармант, бабка-павітуха ў час родаў *«прыгаворвала нейкія заклінанні. Каб не сглазілі, яна прыскала рожаніцу вадой, мазала “угаворным” маслам. Шчэ яна казала: “Прэсвятая наша Багародзіца, сайдзі з прастола Гасподня, бяры свае залатыя ключы і адкрывай у рабы Божай (імя) мясные ворота, і атпушчай младзенца на свет і на Божью волю”»* (зап. ад В. Г. Грудавенка ў в. Баршчоўка).

Лічылася, што на лёс нованароджанага можа паўплываць і сам працэс перарэзвання пупавіны, пры гэтым семантыку абрадавага дзеяння суадносілі з пэўнымі прадметамі, якія маглі адыграць ролю ў вызначэнні кірунку будучай прафесійнай дзейнасці: *«Пупавіну абразалі*

*ў хлопчыкаў на начатым сталярным дзеле, каб ён быў добрым хазяінам, а ў дзевачак – ножніцамі на начатым шыцці»* (зап. ад В. Г. Грудавенка ў в. Баршчоўка).

У структуры пасляродавага перыяду радзінна-хрэсьбіннай абраднасці Добрушчыны вылучаюцца адведкі. У вёсцы Карма першай наведвала парадзіху бабка-павітуха, якая *«праз некалькі дзён ідзе атведаць рожаніцу, бяручы аладкі, кашу, кампот. Бабцы доруць падарунак. Пакуль не прыйдзе бабка, нікога не пушчаюць да рожаніцы»* (зап. ад Ганны Рыгораўны Хацковай, 1931 г. н.). Звычайна прыходзілі да парадзіхі замужнія жанчыны: *«Нельга было прыходзіць у адведкі з пустымі рукамі, а таксама ігнаравалі наведванне жанчыны, якія ждуць дзіцяці або насілі жалобу па памёршых родзічах»* (в. Кругавец-Калініна) [2, с. 200].

У абрадзе хрышчэння дзіцяці, як пацвердзілі жыхары, прымалі ўдзел ганаровыя асобы – кум і кума: *«Пры крашчэнні галоўнымі ўдзельнікамі былі кросныя радзіцелі, іх называлі "кум" і "кума", яго апякунамі»* (зап. ад В. Г. Грудавенка ў в. Баршчоўка). Калі бацькі нованароджанага запрашалі каго-небудзь выконваць гэту пачэсную ролю, то адмаўляцца нельга было: *«У кросныя часта выбіралі родственнікаў – дарослых і багацейшых. Прыглашэнне ў кросныя было вялікай чэсцю і адказвацца было грахом»* (зап. ад В. Г. Грудавенка ў в. Баршчоўка). Іншы раз, калі дзіця нарадзілася хваравітым, то, каб захаваць яго здароўе, выбіраліся кум і кума з ліку незнаёмых людзей, бо *«шчыталася тады, дзіця будзе здаравейшым, і імем нават гэтага чалавека маглі назваць»* (г. Добруш) [2, с. 187]. Менавіта на кумоў ускладаліся абавязкі па выкананні ўсіх абрадавых дзеянняў, звязаных з хрышчэннем немаўляці ў царкве і святкаванні хрэсьбін. Невыпадковым

з'яўляецца наяўнасць матыву іх чакання ў адным з варыянтаў радзінна-хрэсьбінных песень:

*Не кукуй, зязюлечка, рана,*
*Не кажы, што ночачка мала.*
*Наша Маруська ўсю ноч не спала,*
*Яна к сабе мілых гасцей чакала.*
*Мілых гасцей і бабулечкі сваёй.*
*Столікі абрусам засцілала,*
*Кубочкі віном залівала,*
*Кубочкі віном залівала,*
*Яна сваіх кумочкаў паджыдала* (г. Добруш) [2, с. 187].

У мясцовай традыцыі вёскі Перарост дазвалялася запрашаць у кумы першых сустрэчных: *«Хросных выбіралі так: маці выходзіць на скрыжаванне дарог, і хто першы ідзе, таму кажа хрысціць. Нельга было адмаўляцца»* [2, с. 203].

Звычайна кум і кума, якім адводзілася ганаровая місія адвезці дзіця ў царкву, каб яго пахрысціць, *«павінны былі пакупаць падаркі мацеры і яе дзіцёнку. Кум пакупаў крэст, кума прыносіла дзіцёнку рубпшку і трохі сітца ці халста, шчэ прыносіла палаценца свяшчэнніку, каб выцерці рукі пасля акунання ў купель рабёнка»* (зап. ад В. Г. Грудавенка ў в. Баршчоўка). Традыцыя пахрысціць дзіця абавязкова мела ў беларусаў устойлівы характар, бо верылі, што *«некрашчоных дзяцей на тым свеце не прымалі ў свой круг, і яны не ведалі пакою. Такіх дзяцей харанілі на перакрыжаваннях дарог, дзе іх маглі красціць усе, хто ходзіць па гэтым дарогам»* (зап. ад В. Г. Грудавенка ў в. Баршчоўка).

Пасля таго, як святар правядзе цырымонію хрышчэння дзіцяці, першым бярэ на рукі «пахрышчанае» дзіця *«кум – хросны бацька.*

*Затым хросная маці <...> запялёнвае немаўля ў пялёнкі. Калі яны яны прыносяць дзіця ў хату, то кладуць яго пад печ, каб урочлівы не быў»* (зап. ад Марыі Мацвееўны Зароўнай, 1925 г. н., у в. Запрудаўка). Кума прапануе бацькам нованароджанага забраць яго «*з-пад печы*». Пачынаецца святкаванне хрэсьбін, гучаць песні:

*А ў садзе рабінкі,*
*А ў нас сёння радзінкі.*
*А мы ж рабінкі ламаць будзем,*
*А мы радзінкі*
*Ды гуляць будзем* (зап. ад М. М. Зароўнай у в. Запрудаўка).

Калі кум і кума вярталіся з царквы, то, перадаючы ахрышчанае дзіця яго бацькам, гаварылі: *«Бралі навароджанага, Богам даронага, а аддаем вам хрышчонага. Любіце, гадуйце, а часам пільнуйце, ды і он хай вас любя, шануе ды на старасці спагадуе»* (г. Добруш) [2, с. 187]. Калі пахрысцілі дзіця, то кум, выходзячы з царквы, імкнуўся падняць на руках немаўля як мага вышэй і пранесці яго ў такім становішчы, каб «жыццё яго ішло ўверх» (зап. ад Тамары Мамантаўны Буднікавай, 1914 г. н., у в. Дубраўка). Каб забяспечыць заможнае жыццё нованароджанага і каб ён быў паслухмяным, клалі яго на куце пад абразамі: *«В хате в этот день малыша ложат на кожух на куте, где иконы, чтоб был богатый и смиренный»* (зап. ад Т. М. Буднікавай у в. Дубраўка).

Акрамя кумоў, важнай асобай у радзінна-хрэсьбіннай абраднасці была бабка-павітуха, якая павінна была падрыхтаваць абрадавую страву – кашу, гаршчок з яе разбівалі падчас хрэсьбіннага застолля: *«Бабка несла звараную ёй кашу. Яе выкупалі, а затым разбівалі»* (г. Добруш) [2, с. 189]. У гонар бабкі-павітухі выконвалі адрасаваныя ёй песні, напрыклад:

*Каб я знала, ведала,*
*А хто бабкай будзе,*
*Пасадзіла б я яе*
*У агародзе на градзе*
*За чырвоную розу,*
*Палівала б я яе*
*Не вадою, а мёдам* (г. Добруш) [2, с. 190].

Зыходзячы з народных вераванняў, на хрэсьбінах павінна быць весела, таму *«за сталом нужна пець песні, весяліцца, чтоб жызнь у дзіцёнка была такой жа»* (г. Добруш) [2, с. 191 – 192].

Разбіванне гаршка з кашай – важны кампанент у структуры радзінна-хрэсьбіннага абрадавага комплексу, дзе знайшлі ўвасабленне дзве функцыі: сакральная і практычная. «Абрад сімвалізаваў надзею на дабрабыт, здароўе парадзіхі і нованароджанага і даваў магчымасць падмацаваць іх матэрыяльна: сабраць грошы і іншыя падарункі для сям'і і бабкі» [1, с. 33]. Наяўнасць апошняй (утылітарнай) функцыі абраду «бабінай кашы» падмацоўваецца і шматлікімі фактычнымі матэрыяламі: *«Кашу трэба было выкупіць – у тарэлку клалі выкуп. Той, хто заплаце больш выкуп, меў права разбіць гаршок з кашай»* (в. Знамя) [2, с. 198].

Гаршчок з кашай разбівалі ў канцы святкавання хрэсьбін, звычайна гэтую пачэсную ролю выконваў кум, які павінен быў пакласці на кашу грошай больш за іншых гасцей: *«Усе па кругу кладуць грошы на кашу, у каво сколькі ёсць. Кум доўжан выйграць кашу, палажыўшы больш за ўсіх грошай. Гаршок аддаюць куму, і ён доўжан разбіць яго аб вугал стала. Раздавалі кашу гасцям і каждаму давалі па чарапку, якія яны неслі дадому»* (зап. ад Ганны Цімафееўны Казлоўскай, 1940 г. н., у в. Стараселле). Семантыка абрадавай кашы, як сведчаць фактычныя матэрыялы, у пераважнай большасці была звязана з ідэяй спрыяць

працягу роду. Напрыклад, чарапкі ад разбітага гаршка з кашай, паводле народных уяўленняў, мелі пэўнае магічнае значэнне ўплыву на шлюбныя адносіны, нараджэнне дзяцей: *«Маладым дзевушкам давалі кашу, штоб яны выйшлі быстрэй замуж»* (зап. ад Г. Ц. Казлоўскай у в. Стараселле). Госці іншы раз елі кашу з разбітых чарапкоў, што таксама мела магічнае прадуцыравальнае значэнне, звязанае са спрыяннем нараджэнню дзяцей: *«Елі з чарапкоў. Бабка зычыла: каб у гэтай хаце было многа дзетак, як летам у полі кветак»* (г. Добруш) [2, с. 189]. Чарапкі ад гаршка, як было прынята ў многіх лакальных традыцыях Добрушчыны, клалі на галовы тым, *«у каго яшчэ няма дзяцей»* (г. Добруш) [2, с. 192]; *«Гаршок з кашай б'юць, кашу ядзяць, а чэрапкі ад гаршка ложаць маладым на галаву, каб яшчэ ражалі»* (в. Уць) [2, с. 202]; *«Маладым дзевушкам давалі кашу, штоб яны выйшлі быстрэй замуж»* (зап. ад Г. Ц. Казлоўскай у в. Стараселле). Семантыка абрадавых дзеянняў з «бабінай кашай» звязана таксама з пажаданнямі нованароджанаму хутчэй падрастаць. Невыпадкова ў вёсцы Жгунь, каб паспрыяць гэтаму, *«кума за гаршок і бегае па хаце, прыгаворвае*: *"Як я бегаю, штобы маленькае так скоранька бегала"»* (в. Жгунь) [2, с. 192]. Спецыфічна адметным у вёсцы Гардуны было захоўванне чарапкоў ад гаршка з кашай на працягу доўгага часу: *«Вот ён (кум) выкупае і тады ўжо разбівае гаршок, а кума дзеля кашу з гэтага гаршка ўсім гасцям. Гаршок хавалі ў прыпечак, пакуль дзіця не жэніцца»* [2, с. 204].

У невялікай колькасці мясцовых запісаў прадстаўлены звесткі пра ўплыў абрадавай стравы (кашы) на пладавітасць свойскай жывёлы. Маюцца на ўвазе чарапкі ад гаршка з кашай, якія прыносяць дахаты і *«кідаюць у пуню свінням, каб вяліся»* (в. Перарост) [2, с. 201]; *«Кашу гэту бралі ўсе сабе дамоў. Кідалі яе скаціне, штоб скаціна вялася»* (г. п. Церахоўка) [2, с. 203]; *«Разбіты гаршчок клалі ў сараі, каб усё вялося»*

(в. Чырвоная Буда) [2, с. 204]; *«Чугунок разбівалі, і кажды, хто клаў грошы, забіраў абломак чугунка, а самы бальшы – хросны. Кашу аддавалі курам, штоб добра неслісь»* (зап. у г. Гомелі ад Ніны Пятроўны Даніленка, 1959 г. н., пражывала ў г. п. Церахоўка).

Жыхары Добрушчыны надавалі «бабінай кашы» і магічную лекавую сілу: *«Усе прысутныя стараюцца ўкрасць бабінай кашы, калі яе з'ясі, то зубы балець не будуць»* (в. Перарост) [2, с. 201]; *«Осколки от горшка хранились, и при появлении первых зубов у ребёнка осколками горшка тискали по дёснам, чтобы быстрее и легче резались зубы»* (зап. ад Т. М. Буднікавай у в. Дубраўка).

Святкаванне хрэсьбін на Добрушчыне завяршалася жартоўным звычаем «адвозіць бабку-павітуху»: *«Вечарам павітуху каталі па сялу на баране»* (зап. ад В. Г. Грудавенка ў в. Баршчоўка); *«Затым мужыкі прыносілі барану, садзілі на яе бабку і на сабе цягнулі ў карчму. Там працягвалі есці, спяваць і весяліцца»* (в. Знамя) [2, с. 198].

Сістэмна прадстаўленыя матэрыялы па радзінна-хрэсьбінных абрадах і песнях Добрушскага раёна, захоўваючы агульнаэтнічную аснову, дэманструюць багацце мясцовай спецыфікі на ўзроўні розных структурных кампанентаў гэтага абрадавага комплексу і звязаных з імі прыкмет і павер'яў. Прыведзеныя звесткі раскрываюць багаты ўнутраны свет беларусаў, якія з высокай адказнасцю выконвалі абрадавыя дзеянні, сімвалічна скіраваныя на захаванне здароўя немаўляці і яго засцярогу ад няшчасця, прытрымліваліся спрадвеку захаваных у народнай памяці продкаў правіл і прадпісанняў для жанчыны-маці.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А.С. Фядосік [і інш.] ; навук. рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – 422 с.

2. Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі беларусаў (на матэрыяле фальклору Гомельскай вобласці) / аўт.-уклад. В. С. Новак [і інш.]. – Гомель : Барк, 2013. – 380 с.

РЕЗЮМЕ

В статье на основе богатых экспедиционных фактических материалов рассматриваются регионально-локальные особенности родинно-крестинной обрядности одного из районов Гомельской области – Добрушского. Проанализированы отдельные структурные компоненты, их местная специфика, семантика и связь с мифологическими представлениями.

SUMMARY

On the basis of rich factual materials the article studies regional and local peculiarities of the maternity-christening rituals in Gomel region – Dobrush district. Separate structural components, their local peculiarities, semantics and relation to the mythological representatives are analysed.

***Олюнина И. В.***

# ПРОЕКТИРОВАНИЕ ЭТНОГРАФИЧЕСКОГО ТУРА: ПОДГОТОВИТЕЛЬНЫЙ ЭТАП

*Белорусский государственный университет*

*(Поступила в редакцию 06.02.2023)*

В постпандемийный период развития туристической отрасли всё более отчётливо наблюдаются новые тенденции. В практике гостеприимства во многих странах отмечается рост внимания туристов к безопасности региона, увеличение доли краткосрочных поездок, снижение интереса к коллективным средствам размещения, стандартным пакетным турам и массовым направлениям. Экспертами